

# ДА *75*-ГОДДЗЯ
# АЛЕНЫ ВІТАЛЬЕЎНЫ РУЦКАЙ

**Дарагая Алена Вітальеўна!**

За гады, праведзеныя побач з Вамі, мы паспелі спазнаць Вас як чалавека вельмі сціплага і вельмі цікавага, сапраўднага сябра, паплечніка і аднадумца. Заслугоўваюць павагі Вашы здольнасць эфектыўна сумяшчаць навуковую, педагагічную і грамадска-літаратурную дзейнасць, уменне жыць у згодзе з няпростым навакольным светам, прымаць жыццё з удзячнасцю, з верай у нязгаснае святло дабрыні. У Вашым слове гучыць любоў да роднай Беларусі і яе людзей. Няхай жа высокае пачуццё заўсёды будзе ўзаемным, яшчэ доўгія гады чароўным абярэгам сагравае, натхняе Вас на няпростых зямных шляхах. З нагоды Вашага 75-годдзя прыміце шчырыя пажаданні моцнага здароўя, сямейнага дабрабыту, невычэрпнай энергіі і плёну ва ўсіх справах. **З ЮБІЛЕЕМ!**

Калектыў
Гродзенскага абласнога аддзялення
Саюза пісьменнікаў Беларусі

*11 студзеня 2025 года*

